# Слова стала целам

Пастанова
аб хрысталёгіі
служэньня
*Ligonier*

The Word Made Flesh
The Ligonier Statement on Christology
© 2016 by Ligonier Ministries
Second edition
ISBN 978-1-64289-540-7

© Евангелие и Реформация,
пераклад на беларускую мову, 2023

Кім ёсьць Ісус Хрыстос? Бадай ці ня кожная дарослая асоба мае пэўнае меркаваньне аб тым, кім ёсьць Ісус. Гэтыя меркаваньні могуць быць павярхоўнымі, недасьведчанымі альбо наўпрост герэтычнымі. Але ня проста ж меркаваньні, а толькі праўда аб Ісусе мае і будзе мець значэньне ў вечнасьці.

Тыя, хто носіць імя хрысьціянаў, жадаюць ісьці за Хрыстом Ягонымі вучнямі. Таму яны трымаюцца хрысталёгіі — вучэньня аб Хрысьце, якое адлюстроўвае іхняе бачаньне і разуменьне Хрыста. Гэтая хрысталёгія можа быць сфармуляваная ўскосным альбо наўпроставым чынам. Яна можа выяўляць глыбіні біблейскага адкрыцьця і гістарычнай хрысьціянскай думкі аб Сьвятым Пісаньні альбо можа быць у кепскім сэнсе наватарскай і адарванай ад Божага слова. Але ж ніводзін з пасьлядоўнікаў Ісуса ня можа абысьціся без хрысталёгіі.

Паколькі сьледаваньне за Хрыстом ёсьць сутнасьцю хрысьціянства, то царква вякамі намагалася абвяшчаць «Хрыста гісторыі і Сьвятых Пісаньняў», а не «Хрыста нашых уяваў». У гістарычных пастановах, такіх як Нікейска-Канстантынопальскі сымбаль веры, Халкідонскае вызначэньне, Гайдэльбэрскі катэхізіс, Уэстмінстэрскае вызнаньне, хрысьціяне дакладна сфармулявалі біблейскае вучэньне аб Хрысьце.

У нашыя дні гэтымі пастановамі альбо часта пагарджаюць, альбо іх памылкова разумеюць. Гэта вядзе да шырокага распаўсюду блытаніны ў вучэньнях аб асобе і дзеях Хрыста. Дзеля Ягонай славы і дзеля навучаньня Ягонага народу хрысталягічная пастанова служэньня *Ligonier* мае на мэце спалучыць разам гістарычную, артадаксальную, біблейскую хрысталёгію царквы Хрыстовай у форме, якая будзе простай дзеля спавяданьня, карыснай у навучаньні нязьменным палажэньням веры і якая здолее паслужыць агульным вызнаньнем, вакол якога змогуць згуртавацца вернікі з розных цэркваў дзеля вырашэньня місыйных задачаў. Гэтая пастанова не зьяўляецца нейкай заменаю гістарычным сымбалям і вызнаньням царквы, але ёсьць дадаткам, у якім агалошваецца іх супольнае вучэньне аб тым, кім ёсьць Хрыстос і што Ён зьдзейсьніў. Няхай Хрыстос скарыстае яе дзеля Свайго валадарства.

У імя ўцелаўлёнага Сына Божага, нашага Прарока, Сьвятара і Цара. Амэн.

Р. Ч. Спрол
Вясна, 2016

Мы спавядаем таямніцу і цуд Божага ўцелаўленьня
і цешымся нашым вялікім збаўленьнем
у Ісусе Хрысьце, Госпадзе нашым.

Супольна з Айцом і Сьвятым Духам
Сын стварыў усё,
трымае Сваёй моцай усё
і творыць усё новае.
Ён, сапраўдны Бог,
стаў сапраўдным чалавекам —
дзьве прыроды ў адной асобе.

Ён нарадзіўся ад Марыі-дзевы
і жыў сярод нас.
Быў укрыжаваны, памёр і быў пахаваны,
уваскрос на трэці дзень,
узышоў на нябёсы
і прыйдзе ізноў у славе, каб судзіць.

Дзеля нас
Ён выканаў Закон,
адкупіў наш грэх
і ўмілажаліў Божы гнеў.
Ён узяў нашую брудную вопратку
І даў нам адзеньне Ягонай праведнасьці.

Ён — наш Прарок, Сьвятар і Цар,
які будуе Сваю царкву,
хадайнічае аб нас
і ўладарыць над усім.

Ісус Хрыстос — Госпад!
Мы ўслаўляем Ягонае сьвятое імя навекі.
Амэн.

# Сьцьверджаньні і абвяржэньні

*з доказамі*

*зь Сьвятога Пісаньня*

*Артыкул 1*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус ёсьць уцелаўленьнем у гісторыі вечнага Сына Божага, другой асобы Найсьвяцейшай Тройцы. Ён — Хрыстос, абяцаны Богам Месія[1].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос — гэта ці то просты чалавек, ці то прыдумка раньняй хрысьціянскай царквы.

*Артыкул 2*

Мы сьцьвярджаем, што ў адзінстве Боства спрадвечна народжаны Сын ёсьць адзінасутным *(homoousios)* і роўным у Боскай годнасьці і вечнасьці Айцу і Сьвятому Духу[2].

Мы адмаўляем, што Сын — гэта ўсяго толькі падабенства Бога *(homoiousios)* альбо што Ён быў проста ўсыноўлены Айцом. Мы адмаўляем вечную падпарадкаванасьць Сына Айцу ў анталягічнай Тройцы.

*Артыкул 3*

Мы сьцьвярджаем, згодна зь Нікейскім і Халкідонскім сымбалямі веры, што Ісус Хрыстос — гэта сапраўдны Бог і сапраўдны чалавек, дзьве прыроды, зьяднаныя ў аднай асобе назаўжды[3].

Мы адмаўляем, што Сын быў створаны. Мы адмаўляем, што некалі быў час, калі Сын ня быў Богам. Мы адмаўляем, што чалавечае цела і душа Ісуса Хрыста існавалі перш, чым Сын уцелавіўся цягам гісторыі.

---

[1] «На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Богам… І Слова стала целам, і пасялілася між намі, поўнае ласкі і праўды; і мы бачылі славу Ягоную, славу, як Адзінароднага ад Айца» (Ян. 1:1, 14). Глядзіце таксама Пс. 109:1; Мц. 3:17; 8:29; 16:16; Мк. 1:1, 11; 15:39; Лк. 22:70; Ян. 4:25–26; Дзеі 5:42; 9:22; Гал. 4:4; Флп. 2:6; Кал. 2:9; Габ. 5:7; 1 Ян. 5:20.

[2] «…Дык ідзеце, навучайце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца і Сына і Сьвятога Духа» (Мц. 28:19). Глядзіце таксама Ян. 1:18; 3:16–18; 10:30; 20:28; 2 Кар. 13:14; Эф. 2:18.

[3] «Бо ў Ім жыве ўся паўната Боства цялесна» (Кал. 2:9). Глядзіце таксама Лк. 1:35; Ян. 10:30; Рым. 9:5; 1 Цім. 3:16; 1 Пят. 3:18.

*Артыкул 4*

Мы сьцьвярджаем гіпастасную еднасьць, а менавіта што дзьве прыроды Ісуса Хрыста зьядналіся ў Ягонай адзінай асобе бязь зьмешваньня, зьліцьця, падзелу ці разлучэньня[4].

Мы адмаўляем, што адрозьненьне дзьвюх прыродаў зьяўляецца іх падзяленьнем.

*Артыкул 5*

Мы сьцьвярджаем, што з уцелаўленьнем Ісуса Хрыста Ягоныя Боская і чалавечая прыроды захоўваюць свае ўласьцівыя якасьці. Мы сьцьвярджаем, што якасьці абедзьвюх прыродаў належаць адзінай асобе Ісуса Хрыста[5].

Мы адмаўляем, што чалавечая прырода Ісуса Хрыста мае Боскія якасьці альбо можа зьмяшчаць Боскую прыроду. Мы адмаўляем, што Боская прырода перадае Боскія якасьці чалавечай прыродзе. Мы адмаўляем, што Сын выракся альбо адмовіўся ад хоць якіх Сваіх Боскіх якасьцяў пры ўцелаўленьні.

---

[4] «Сымон Пётр сказаў у адказ: „Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога“. І Ісус сказаў яму ў адказ: „Дабрашчасны ты, Сымоне, сыне Ёнаў, бо ня плоць і кроў адкрылі табе гэта, а Айцец Мой, Які ёсьць у нябёсах“» (Мц. 16:16–17). Глядзіце таксама Лк. 1:35; Ян. 1:1–3; 8:58; 17:5; Дзеі 20:28; Рым. 1:3–4; 9:5; 2 Кар. 8:9; Кал. 2:9; 1 Цім. 3:16; 1 Пят. 3:18; Адкр. 1:8, 17; 22:13.

[5] «Бо ў вас павінны быць тыя самыя адчуваньні, як і ў Хрысьце Ісусе; Ён, быўшы ў Божай прыродзе, не палічыў за рабунак Сваю роўнасьць з Богам, а прынізіў Сябе Самога, узяўшы вобраз раба, зрабіўшыся падобным на людзей і з выгляду стаўшыся, як чалавек» (Флп. 2:5–7). Глядзіце таксама Мц. 9:10; 16:16; 19:28; Ян. 1:1; 11:27, 35; 20:28; 1 Пят. 3:18; 2 Пят. 1:1; Рым. 1:3–4; 9:5; Эф. 1:20–22; Кал. 1:16–17; 2:9–10; 1 Цім. 3:16; Габ. 1:3, 8–9.

*Артыкул 6*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос — гэта бачны вобраз Бога, узор сапраўднай чалавечнасьці і што ў нашым адкупленьні мы ўрэшце будзем прыведзеныя ў адпаведнасьць Ягонаму вобразу[6].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос быў трохі меней, чым сапраўдны чалавек, што Ягоная чалавечнасьць была толькі ўявай альбо што Ён ня меў разумнай чалавечай душы. Мы адмаўляем, што ў гіпастаснай еднасьці Сын прыняў чалавечую асобу, але не чалавечую прыроду.

*Артыкул 7*

Мы сьцьвярджаем, што як сапраўдны чалавек Ісус Хрыстос прыняў у Сваім стане прыніжэньня ўсе прыродныя абмежаваньні і немачы, уласьцівыя чалавечай прыродзе. Мы сьцьвярджаем, што Ён быў такі самы, як мы, ва ўсіх сэнсах, але ж бяз грэху[7].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос грашыў. Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос ня зьведаў праўдзівых пакутаў, спакусаў альбо выпрабаваньняў. Мы адмаўляем, што грэх — гэта неад'емная рыса сапраўднай чалавечнасьці альбо што бязгрэшнасьць Ісуса Хрыста ёсьць несумяшчальнай з сапраўднасьцю Ягонай чалавечнасьці.

---

[6] «Які ёсьць вобраз Бога нябачнага, народжаны раней за ўсякае стварэньне; бо Ён стварыў усё, што на нябёсах і што на зямлі, бачнае і нябачнае: хай тое троны, хай тое дзяржавы, хай тое начальствы, хай тое ўлады, — усё Ім і для Яго створана» (Кал. 1:15–16). Глядзіце таксама Рым. 8:29; 2 Кар. 4:4–6; Эф. 4:20–24; Габ. 1:3–4.

[7] «Таму Ён павінен быў ва ўсім прыпадобніцца да братоў, каб быць міласэрным і верным Першасьвятаром прад Богам на ўмілажальваньне за грахі народу. Бо, як сам Ён перацярпеў, быў спакушаны, дык можа памагчы і тым, каго спакушаюць» (Габ. 2:17–18). Глядзіце таксама Міх. 5:2; Лк. 2:52; Рым. 8:3; Гал. 4:4; Флп. 2:5–8; Габ. 4:15.

*Артыкул 8*

Мы сьцьвярджаем, што гістарычны Ісус Хрыстос быў цудоўным чынам зачаты моцаю Сьвятога Духа і народжаны ад Марыі-дзевы. Мы сьцьвярджаем, згодна з Халкідонскім сымбалем веры, што яна справядліва завецца маці Божай *(theotokos)*, бо дзіцёнак, якога яна вынасіла, — гэта ўцелаўлёны Сын Божы, другая асоба Найсьвяцейшай Тройцы[8].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос атрымаў Сваю Боскую прыроду праз Марыю альбо што Ягоная бязгрэшнасьць мела пачатак у ёй.

[8] «А на шостым месяцы пасланы быў анёл Гаўрыіл ад Бога ў горад Галілейскі, які называўся Назарэт, да дзевы, заручанай з мужам, імем Язэп, з дому Давідавага; а імя ў дзевы: Марыя» (Лк. 1:26–27). Глядзіце таксама Мц. 1:23; 2:11; Лк. 1:31, 35, 43; Рым. 1:3; Гал. 4:4.

*Артыкул 9*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос — гэта апошні Адам, які меў посьпех у выкананьні Сваёй місыі ў кожным моманце, дзе першы Адам пацярпеў няўдачу, і што Ісус Хрыстос — на чале Свайго народу, цела Хрыстовага[9].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос прыняў грахоўную чалавечую натуру альбо ўспадкаваў першародны грэх.

[9] «А таму, як праз аднаго чалавека грэх увайшоў у сьвет, і праз грэх — сьмерць, так і сьмерць перайшла ва ўсіх людзей, бо ў ім усе зграшылі. Бо і да закона грэх быў у сьвеце; але грэх не залічваецца, калі няма закона. Аднак жа сьмерць панавала ад Адама да Майсея і над тымі, якія не зграшылі падобна правіннасьці Адама, які ёсьць вобраз будучага, але дар ласкі ня як правіна. Бо праз правіну аднаго памерлі многія, дык тым больш ласка Божая і дар праз ласку аднаго Чалавека, Ісуса Хрыста, шчодра красуюць для многіх. І дар ня як суд за аднаго грэшніка; бо суд за адну правіну прыносіць асуду, а дар ласкі за многія правіны — апраўданьне. Бо калі за правіну аднаго сьмерць панавала праз аднаго, дык тым болей тыя, што прымаюць шчадроты ласкі і дар праведнасьці, будуць панаваць у жыцьці праз адзінага Ісуса Хрыста. Вось таму, як праз правіну аднаго ўсім людзям асуда, так і праз праведнасьць аднаго ўсім людзям апраўданьне да жыцьця. Бо, як празь непаслушэнства аднаго чалавека зрабіліся многія грэшнікамі, так і праз паслушэнства аднаго стануць праведнымі многія. А закон прыйшоў пасьля, і так памножыліся правіны. А калі памножыўся грэх, шчодра закрасавала ласка, каб, як грэх панаваў дзеля сьмерці, так і ласка запанавала праз праведнасьць дзеля жыцьця вечнага Ісусам Хрыстом, Госпадам нашым» (Рым. 5:12–21). Глядзіце таксама 1 Кар. 15:22, 45–49; Эф. 2:14–16; Кал. 1:18.

*Артыкул 10*

Мы сьцьвярджаем дзейснае і цярплівае паслушэнства Ісуса Хрыста ў тым, што цягам Свайго дасканалага жыцьця Ён цалкам выканаў дзеля нас справядлівыя патрабаваньні закона і што Ён Сваёй сьмерцю на крыжы панёс пакараньне за нашыя грахі[10].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос хоць дзе-нідзе пацярпеў паразу ў выкананьні Божага закона альбо паслушэнстве яму. Мы адмаўляем, што Ён адмяніў маральны закон.

*Артыкул 11*

Мы сьцьвярджаем, што на крыжы Ісус Хрыстос прынёс сябе ў ахвяру як плату адкупленьня за грахі Свайго народу. Такім чынам Ён умілажаліў Божы гнеў, задаволіў Божае правасудзьдзе і перамог грэх, сьмерць і сатану[11].

Мы адмаўляем, што сьмерць Ісуса Хрыста была платаю доўгу сатане. Мы адмаўляем, што сьмерць Ісуса Хрыста была ўсяго толькі ці то прыкладам, ці то перамогай над сатаною, ці то паказам маральнай сутнасьці Божага валадараньня.

---

[10] «Бо, як праз непаслушэнства аднаго чалавека зрабіліся многія грэшнікамі, так і праз паслушэнства аднаго стануць праведнымі многія» (Рым. 5:19). Глядзіце таксама Мц. 3:15; Ян. 8:29; 2 Кар. 5:21; Флп. 2:8; Габ. 5:8.

[11] «Атрымліваючы апраўданьне дарам, паводле ласкі Ягонай, адкупленьнем у Ісусе Хрысьце, Якога Бог прынёс у ахвяру ўмілажальваньня ў Крыві Ягонай праз веру, для паказу справядлівасьці Ягонай ў дараваньні грахоў, учыненых раней» (Рым. 3:25–26). Глядзіце таксама Іс. 53; Рым. 5:6, 8, 15; 6:10; 7:4; 8:34; 14:9, 15; 1 Кар. 15:3; Эф. 5:2; 1 Фес. 5:10; 2 Цім. 2:11; Габ. 2:14, 17; 9:14–15; 10:14; 1 Пят. 2:24; 3:18; 1 Ян. 2:2; 3:8; 4:10.

*Артыкул 12*

Мы сьцьвярджаем вучэньне аб падвойным залічваньні ў тым сэнсе, што празь веру наш грэх залічваецца Ісусу Хрысту, а Ягоная праведнасьць залічваецца нам[12].

Мы адмаўляем, што грэх можа быць дараваны беспакарана. Мы адмаўляем, што дзейснае паслушэнства Ісуса Хрыста не залічваецца нам.

*Артыкул 13*

Мы сьцьвярджаем, што на трэці дзень Ісус Хрыстос паўстаў з памерлых і што многія бачылі Яго жывым у целе[13].

Мы адмаўляем, што сьмерць Ісуса Хрыста была ўяўнай, альбо што толькі Ягоны дух застаўся жывы, альбо што Ягонае ўваскрасеньне мела месца толькі ў сэрцах Ягоных пасьлядоўнікаў.

*Артыкул 14*

Мы сьцьвярджаем, што ў стане Свайго праслаўленьня Ісус Хрыстос у Сваёй славе зьяўляецца Пачаткам уваскрасеньня, што Ён адолеў і грэх, і сьмерць. У еднасьці зь Ім мы таксама будзем уваскрэсеныя[14].

Мы адмаўляем, што праслаўленае ва ўваскрасеньні цела Ісуса Хрыста было цалкам адрозным ад цела, якое паклалі ў магілу ў садзе. Мы адмаўляем, што нашае ўваскрасеньне — гэта ўсяго толькі ўваскрасеньне нашых душаў, а ня целаў.

---

[12] «Бо Таго, Хто ня ведаў грэху, Ён зрабіў нам ахвяраю за грэх, каб мы ў Ім зрабіліся праведнымі перад Богам» (2 Кар. 5:21). Глядзіце таксама Мц. 5:20; Рым. 3:21–22; 4:11; 5:18; 1 Кар. 1:30; 2 Кар. 9:9; Эф. 6:14; Флп. 1:11; 3:9; Габ. 12:23.

[13] «Бо я найперш перадаў вам, што і сам прыняў, гэта значыцца, што Хрыстос памёр за грахі нашыя, паводле Пісаньня, і што Ён пахаваны быў і што ўваскрэс на трэці дзень, паводле Пісаньня, і што зьявіўся Кіфу, потым дванаццаці» (1 Кар. 15:3–5). Глядзіце таксама Іс. 53; Мц. 16:21; 26:32; 28:1–10; Ян. 21:14; Дзеі 1:9–11; 2:25, 32; 3:15, 26; 4:10; 5:30; 10:40; Рым. 4:24–25; 6:9–10; Эф. 4:8–10.

[14] «Але Хрыстос уваскрэс зь мёртвых, першынец з памерлых… Сьмерць! Дзе тваё джала? Пекла! Дзе твая перамога?» (1 Кар. 15:20, 55). Глядзіце таксама Рым. 5:10; 6:4, 8, 11; 10:9; 1 Кар. 15:23; 2 Кар. 1:9; 4:10–11; Эф. 2:6; Кал. 2:12; 2 Фес. 2:13; Габ. 2:9, 14; 1 Ян. 3:14; Адкр. 14:4; 20:14.

*Артыкул 15*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос узьнёсься на Свой нябесны пасад, які стаіць праваруч Бога Айца, і што Ён цяпер валадарыць як Цар, і што Ён неўзабаве вернецца навідавоку ў моцы і хвале[15].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос памыляўся наконт часу Свайго вяртаньня.

*Артыкул 16*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос выліў Свайго Духа ў дзень Пяцідзясятніцы і што ў часе цяперашняга служэньня Ён валадарыць па-над усім, хадайнічае за Свой народ і будуе як адзіны Глава Сваю царкву, якая ачольваецца толькі Ім[16].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос прызначыў рымскага біскупа Ягоным намесьнікам альбо што нейкая іншая асоба, акрамя Ісуса Хрыста, можа быць на чале царквы.

---

[15] «Пасьля гэтага яны, сыйшоўшыся, пыталіся ў Яго, кажучы: „Ці ня гэтым часам, Госпадзе, аднаўляеш Ты царства Ізраілю?“ А Ён сказаў ім: „Ня вам ведаць часіны ці поры, якія Айцец назначыў Сваёй уладай; а вы прымеце сілу, як зыйдзе на вас Дух Сьвяты, і будзеце Мне за сьведкаў у Ерусаліме і ва ўсёй Юдэі і Самарыі і нават па край зямлі“. Сказаўшы гэта, Ён узьнёсься на вачах у іх, і воблака ўзяло Яго з вачэй іхніх. І калі яны глядзелі на неба падчас ушэсьця Ягонага, раптам сталі перад імі два мужы ў белым убраньні і сказалі: „Мужы Галілейскія! Што вы стаіце і глядзіце на неба? Гэты Ісус, што ўзьнёсься ад вас на неба, прыйдзе гэтак сама, як вы бачылі Яго, калі ўзносіўся на неба“» (Дзеі 1:6–11). Глядзіце таксама Лк. 24:50–53; Дзеі 1:22; 2:33–35; Эф. 4:8–10; 1 Цім. 3:16.

[16] «І ўсё ўпакорыў пад ногі Яму, і паставіў Яго вышэй за ўсё, галавою Царквы» (Эф. 1:22). Глядзіце таксама Дзеі 2:33; 1 Кар. 11:3–5; Эф. 4:15; 5:23; Кал. 1:18.

*Артыкул 17*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос прыйдзе ізноў у славе, каб судзіць усе народы, паваліць урэшце долу ўсіх Сваіх ворагаў, зьнішчыць сьмерць і ўсталюе новае неба і новую зямлю, дзе Ён будзе справядліва валадарыць[17].

Мы адмаўляем, што канчатковае вяртаньне Ісуса Хрыста адбылося ў 70 г. Р. Х. і што Ягонае прышэсьце, а таксама спадарожныя таму падзеі трэба разглядаць у сымбалічным рэчышчы.

*Артыкул 18*

Мы сьцьвярджаем, што тыя, хто верыць у імя Госпада Ісуса Хрыста, будуць прынятыя ў Ягоным вечным валадарстве, але тыя, хто ня верыць у Яго, сьведама ўзьведаюць вечнае пакараньне ў пекле[18].

Мы адмаўляем, што кожны чалавек будзе збаўлены. Мы адмаўляем, што тыя, хто памрэ бязь веры ў Ісуса Хрыста, будуць проста зьнішчаныя.

---

[17] «І Ён наказаў нам прапаведаваць людзям і сьведчыць, што Ён ёсьць вызначаны Богам Судзьдзя жывым і мёртвым» (Дзеі 10:42). Глядзіце таксама Ян. 12:48; 14:3; Дзеі 7:7; 17:31; 2 Цім. 4:1, 8.

[18] «Пашле Сын Чалавечы анёлаў Сваіх, і зьбяруць з Царства Яго ўсе спакусы і тых, што чыняць беззаконьне, і ўкінуць іх у печ вогненную; там будзе плач і скрыгат зубоў; тады праведныя зазьзяюць, як сонца, у Царстве Айца іх. Хто мае вушы, каб чуць, няхай чуе!» (Мц. 13:41–43). Глядзіце таксама Іс. 25:6–9; 65:17–23; 66:21–23; Дан. 7:13–14; Мц. 5:29–30; 10:28; 18:8–9; Мк. 9:42–49; Лк. 1:33; 12:5; Ян. 18:36; Кал. 1:13–14; 2 Фес. 1:5–10; 2 Цім. 4:1, 18; Габ. 12:28; 2 Пят. 1:11; 2:4; Адкр. 20:15.

*Артыкул 19*

Мы сьцьвярджаем, што ўсе, хто быў абраны ў Ісусе Хрысьце перад стварэньнем сьвету і хто зьяднаны зь Ім праз веру, цешацца супольнасьцю зь Ім і з усімі сьвятымі. Мы сьцьвярджаем, што ў Ісусе Хрысьце мы цешымся кожным духоўным дабраславеньнем, уключна з апраўданьнем, усынаўленьнем, асьвячэньнем і праслаўленьнем[19].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос і Ягоная збаўчая дзейнасьць могуць быць падзеленыя. Мы адмаўляем, што мы здольныя скарыстацца збаўчай дзейнасьцю Ісуса Хрыста без самога Ісуса Хрыста. Мы адмаўляем, што мы можам быць зьяднаныя зь Ісусам Хрыстом бязь еднасьці зь Ягоным целам, царквой.

*Артыкул 20*

Мы сьцьвярджаем вучэньне аб апраўданьні толькі вераю, гэта значыць, што Бог абвяшчае нас праведнымі дзеяньнем Ягонай ласкі толькі праз веру, толькі ў асобе і дзейнасьці Ісуса Хрыста бяз нашых асабістых вартасьцяў альбо справаў. Мы сьцьвярджаем, што адмаўленьне вучэньня аб апраўданьні толькі вераю азначае адмову ад дабравесьця[20].

Мы адмаўляем, што мы апраўдваемся праз нейкае ўліцьцё праведнасьці ў нас. Мы адмаўляем, што маем апраўданьне толькі тады, калі мы дасягнулі ўнутранай праведнасьці. Мы адмаўляем, што апраўданьне цяпер альбо калісьці будзе заснаванае на нашай вернасьці.

---

[19] «Бо ўсе мы адным Духам хрысьціліся ў адно цела, юдэі альбо эліны, рабы альбо вольнікі, і ўсе напоены адным Духам» (1 Кар. 12:13). Глядзіце таксама Ян. 14:20; 15:4–6; Рым. 6:1–11; 8:1–2; 12:3–5; 1 Кар. 1:30–31; 6:15–20; 10:16–17; 12:27; 2 Кар. 5:17–21; Гал. 3:25–29; Эф. 1:2–10, 22–23; 2:1–6; 3:6; 4:15–16; 5:23, 30; Кал. 1:18; 2:18–19.

[20] «Дык вось, апраўдаўшыся вераю, мы маем мір з Богам праз Госпада нашага Ісуса Хрыста» (Рым. 5:1). Глядзіце таксама Лк. 18:14; Рым. 3:24; 4:5; 5:10; 8:30; 10:4, 10; 1 Кар. 6:11; 2 Кар. 5:19, 21; Гал. 2:16–17; 3:11, 24; 5:4; Эф. 1:7; Ціт. 3:5, 7.

*Артыкул 21*

Мы сьцьвярджаем вучэньне аб асьвячэньні як тое, што на аснове дзеі Ісуса Хрыста, моцай Сьвятога Духа Бог выбаўляе нас ад улады грэху, ахоўвае і ўчыняе нас сьвятымі шляхам нашага паступовага ўпадабленьня вобразу Ягонага Сына. Мы сьцьвярджаем, што асьвячэньне — гэта дзеяньне Божай ласкі і што яно неад'емна злучанае з апраўданьнем, хоць і зьяўляецца адрозным ад яго. Мы сьцьвярджаем, што ў Боскай дзейнасьці асьвячэньня мы ёсьць ня проста адасобленымі назіральнікамі, але мы цалкам адказныя за прымяненьне прызначаных Богам сродкаў ласкі ў нашым няспынным памкненьні памерці для грэху і жыць у паслушэнстве Госпаду[21].

Мы адмаўляем, што чалавек можа апраўдацца без непасрэднага прынясеньня плоду еднасьці зь Ісусам Хрыстом у асьвячэньні. Мы адмаўляем, што нашыя добрыя справы, хоць і прымальныя для Бога ў Ісусе Хрысьце, маюць вартасьць апраўданьня. Мы адмаўляем, што ў гэтым жыцьці нашае змаганьне з грахом, які жыве ў нас, некалі спыніцца, нават калі грэх не ўладарыць над намі.

[21] «Дабраславёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, што дабраславіў нас у Хрысьце ўсякім духоўным дабраславеньнем у нябёсах, бо Ён выбраў нас у Ім перад стварэньнем сьвету, каб мы былі сьвятыя і беспахібныя перад Ім у любові» (Эф. 1:3–4). Глядзіце таксама Ян. 17:17; Дзеі 20:32; Рым. 6:5–6, 14; 8:13; 1 Кар. 6:11; 2 Кар. 7:1; Гал. 5:24; Эф. 3:16–19; 4:23–24; Флп. 3:10; Кал. 1:10–11; 2 Фес. 2:13; Габ. 12:14.

*Артыкул 22*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос — адзіны пасрэднік паміж Богам і Ягоным народам. Мы сьцьвярджаем пасрэдніцкую ролю Ісуса Хрыста як прарока, сьвятара і цара і ў стане Ягонага прыніжэньня, і ў стане Ягонага ўзвышэньня. Мы сьцьвярджаем, што Ён быў памазаны Сьвятым Духам дзеля таго, каб выканаць пасрэдніцкае служэньне, да якога Ён быў пакліканы Айцом[22].

Мы адмаўляем, што Бог меў альбо будзе мець нейкія іншыя ўцелаўленьні альбо што ці то ёсьць, ці то маюць зьявіцца якіясьці іншыя пасрэднікі адкупленьня, акрамя Госпада Ісуса Хрыста. Мы адмаўляем збаўленьне безадносна адзінага Ісуса Хрыста.

*Артыкул 23*

Мы сьцьвярджаем, што ў якасьці найвышэйшага прарока Божага Ісус Хрыстос быў роўным чынам суб'ектам і аб'ектам прарочаньня. Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос адкрыў і абвясьціў волю Божую, прадказаў падзеі ў будучыні. У Ім — спаўненьне Божых абяцаньняў[23].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос хоць некалі прарочыў ілжыва ці нават сказаў адно ілжывае слова альбо што Ён ці то ня змог, ці то ня зможа выканаць усе прароцтвы адносна сябе самога.

---

[22] «Бо адзіны Бог, адзіны і пасрэднік паміж Богам і людзьмі, Чалавек Хрыстос Ісус» (1 Цім. 2:5). Глядзіце таксама Ёў 33:23–28; Лк. 1:33; Ян. 1:1–14; 14:6; Дзеі 3:22; Кал. 1:15; Габ. 1:1–4; 5:5–6; 9:15; 12:24.

[23] «А цяпер я ведаю, браты, што вы, як і начальнікі вашыя, зрабілі гэта праз несьвядомасьць; а Бог так учыніў, як прадвяшчаў вуснамі ўсіх Сваіх прарокаў — пацярпець Хрысту, так і выканаў. Дык пакайцеся і навярнецеся, каб загладзіліся грахі вашыя, хай прыйдуць часіны лагоды ад аблічча Гасподняга, і хай пашле Ён наканаванага вам Ісуса Хрыста, Якога неба павінна было прыняць да часу зьдзяйсьненьня ўсяго, што казаў Бог вуснамі ўсіх сьвятых Сваіх прарокаў ад веку. Майсей сказаў бацькам: „Гасподзь Бог ваш паставіць вам з братоў вашых Прарока, як мяне; слухайцеся Яго ва ўсім, што Ён ні будзе казаць вам“» (Дзеі 3:17–22). Глядзіце таксама Мц. 20:17; 24:3; 26:31, 34, 64; Мк. 1:14–15; Лк. 4:18–19; Ян. 13:36; 21:22; 1 Кар. 1:20; Габ. 1:2; Адкр. 19:10.

*Артыкул 24*

Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос — наш вялікі першасьвятар паводле чыну Мелхісэдэка, які дзеля нас прынёс сябе ў дасканалую ахвяру і які працягвае хадайнічаць за нас перад Айцом. Мы сьцьвярджаем, што Ісус Хрыстос ёсьць суб’ект і аб’ект найвялікшай ахвяры адкупленьня[24].

Мы адмаўляем, што Ісус Хрыстос, які паходзіў з племені Юдавага, а ня з племені Лявіінага, мае быць дыскваліфікаваным з служэньня ў якасьці нашага сьвятара. Мы адмаўляем, што Ён кожным разам прыносіць сябе ў ахвяру ў імшы ў якасьці ахвяры і сьвятара, нават бяскроўным чынам. Мы адмаўляем, што Ён стаўся сьвятаром толькі ў небе і ня быў ім на зямлі.

*Артыкул 25*

Мы сьцьвярджаем, што як Цар Ісус Хрыстос вярхоўна валадарыць над зямнымі і звышнатуральнымі ўладамі цяпер і заўсёды[25].

Мы адмаўляем, што валадарства Ісуса Хрыста ёсьць палітычным валадарствам гэтага сьвету. Мы адмаўляем, што зямныя кіраўнікі не дадуць справаздачы перад Ім.

---

[24] «Ды і ўсё амаль паводле закона ачышчаецца крывёю, і без праліцьця крыві не бывае дараваньня. Таму і вобразы нябеснага павінны былі ачышчацца гэтымі, а самае нябеснае лепшымі за гэтыя ахвярамі. Бо Хрыстос увайшоў не ў рукатворнае сьвяцілішча, паводле вобразу сапраўднага ўсталяванае, а ў самое неба, каб стаць сёньня за нас перад абліччам Божым» (Габ. 9:24–28). Глядзіце таксама Ян. 1:36; 19:28–30; Дзеі 8:32; 1 Кар. 5:7; Габ. 2:17–18; 4:14–16; 7:25; 10:12, 26; 1 Пят. 1:19; Адкр. 5:6, 8, 12–13; 6:1, 16; 7:9–10, 14, 17; 8:1; 12:11; 13:8; 15:3.

[25] «Бо Яму належыць валадарыць, пакуль „пакладзе ўсіх ворагаў пад ногі Свае“» (1 Кар. 15:25). Глядзіце таксама Пс. 109; Мц. 28:18–20; Лк. 1:32; 2:11; Дзеі 2:25, 29, 34; 4:25; 13:22, 34, 36; 15:16; Рым. 1:3; 2 Цім. 2:8; Габ. 4:7; Адкр. 3:7; 5:5; 22:16.

*Артыкул 26*

Мы сьцьвярджаем, што, калі Ісус Хрыстос адолее ўсіх Сваіх ворагаў, Ён перадасьць Сваё валадарства Айцу. Мы сьцьвярджаем, што ў новым небе і на новай зямлі Бог будзе разам з Сваім народам і што верныя пабачаць увачавідкі Ісуса Хрыста, зробяцца падобнымі да Яго і будуць вечна цешыцца ў Ім[26].

Мы адмаўляем, што ёсьць нейкая іншая надзея, альбо імя, альбо шлях для чалавецтва, дзе можна было б знайсьці збаўленьне, апрача як толькі ў Ісусе Хрысьце.

[26] «А потым канец, калі Ён перадасьць Царства Богу і Айцу, калі скасуе ўсякае начальства і ўсякую ўладу і сілу; бо Яму належыць валадарыць, пакуль „пакладзе ўсіх ворагаў пад ногі Свае“, а як апошні вораг зьнішчыцца — сьмерць, бо „ўсё пакарыў пад ногі Ягоныя“; калі ж сказана, што Яму ўсё падначалена, дык ясна, што акрамя Таго, Які пакарыў Яму ўсё. Калі ж усё ўпакорыць Яму, тады і сам Сын скарыцца Таму, Хто скарыў усё Яму, хай будзе Бог усё ва ўсім» (1 Кар. 15:24–28). Глядзіце таксама Іс. 65:17; 66:22; Флп. 2:9–11; 2 Пят. 3:13; 1 Ян. 3:2–3; Адкр. 21:1–5; 22:1–5.

# Тлумачальнае эсэ

*з парадамі*

*для карыстаньня*

Калісьці па ўсёй зямлі прагрыміць адно-адзінае спавяданьне: «Ісус Хрыстос — Госпад» (Флп. 2:11). Гэты кароткі сказ перапоўнены зьместам. Сьцьверджаньне, што Ісус ёсьць Хрыстос, роўнае сьцьверджаньню таго, што Ён — Памазанец. Гэта азначае, што Ён — абяцаны Богам доўгачаканы Месія. А сьцьверджаньне, што Ісус Хрыстос — Госпад, роўнае спавяданьню таго, што Ён ёсьць сапраўдным Богам і сапраўдным чалавекам. Уцелаўленьне – гэта найвялікшы з цудаў, дзівосная таямніца. Бог прыняў цела. І нават самое называньне Яго імем Ісус роўнае вызнаньню Яго адным і адзіным Збаўцам, які прыйшоў у сьвет з місыяй збавіць Свой народ ад яго грахоў (Мц. 1:21).

Выраз «Ісус Хрыстос — Госпад» зьяўляецца сымбалем веры (англ. *creed*), яе сьціслым вызнаньнем. Ангельскае слова *creed* паходзіць ад свайго лацінскага адпаведніка *credo*, які перакладаецца «я веру». Гэты кароткі сымбаль абвяшчае тое, у што мы верым аб Хрысьце. Некаторыя мяркуюць, нібыта ўрывак 1 Цім. 3:16 таксама можа быць сымбалем веры. На тое ёсьць дзьве прычыны. Па-першае, апостал Павел сам выкарыстоўвае гэты выраз: «І, *прызнана ўсімі* — вялікая ёсьць пабожнасьці таямніца». Па-другое, радкі гэтага верша маюць пэўны рытм і, адпаведна, выражаныя ў паэтычнай форме. Яны ўяўляюць сабой сьціслае падсумаваньне вучэньня аб уцелаўлёным Хрысьце:

> Бог зьявіўся ў плоці,
> апраўдаў Сябе ў Духу,
> паказаў Сябе анёлам,
> прапаведаны ў народах,
> прыняты вераю ў сьвеце,
> узьнёсься ў славе (1 Цім. 3:16).

Гэты ўзор зь Бібліі вельмі важны. Калі раньняя царква склікала саборы і фармулявала іншыя сымбалі,

то тады не стваралася новага метаду спавяданьня веры. Усё гэта мелася трымацца цьвёрда ўсталяванай біблейскай традыцыі.

Як толькі паўставалі нейкія выклікі, раньняя царква адразу на тое рэагавала. Больш таго, шмат хто мяркуе, што літургічныя патрэбы альбо жаданьне чысьціні пакланеньня таксама падштурхоўвалі царкву да напісаньня сымбаляў веры. Гэта насамрэч справядліва датычна вучэньня аб Хрысьце. Сутнасная праўда аб асобе і дзеі Ісуса была адметнай рысаю хрысьціянства праз вякі.

Ужо самі аўтары тэкстаў Новага Запавету змагаліся супроць памылковых уяўленьняў аб Хрыстовай ідэнтычнасьці і Ягоных дзеях. У першыя стагодзьдзі існаваньня царквы розныя групоўкі адмаўлялі сапраўднасьць чалавечай прыроды Хрыста. Адна з груповак — дакетысты — заяўляла, што Ісус толькі «здаваўся» чалавекам. Іншыя ж ерасі, як, напрыклад, арыянства, адмаўлялі праўдзівасьць боскасьці Ісуса. Сьцьвярджалася, што Ён быў меншы за Бога Айца. Некаторыя пазьнейшыя групоўкі памыляліся ў вызначэньнях наконт таго, якім чынам дзьве прыроды Хрыста, сапраўдная чалавечая і сапраўдная Боская, спалучаюцца ў еднасьці Ягонай асобы. Раньняя царква адказвала на гэтыя выклікі і аблуды скліканьнямі сабораў і напісаньнем сымбаляў, якія падсумоўвалі біблейскае вучэньне аб галоўных прынцыпах хрысьціянскае веры. Гэтыя сымбалі — найбагацейшая спадчына, што перадавалася з пакаленьня ў пакаленьне. Такім чынам, сёньня мы маем у якасьці крыніц Апостальскі, Нікейскі сымбалі веры, а таксама Халкідонскае азначэньне. Усе яны служаць яснаму разьмежаваньню паміж праўдзівым вучэньнем і ерасьсю.

Гэтыя сымбалі паслужылі ўмацаваньню царквы і, пад аховай поўнай ласкі ўладарнай рукі Божай, дапамагалі хрысьціянам верна абвяшчаць Эвангельле. Іх прамаўляюць сёньня ў якасьці сьведчаньня іхняе немінушчае вартасьці. Імі нам нагадваецца, што Хрыстос знаходзіцца ў цэнтры нашага багаслоўя і нашага

пакланеньня. Сымбалі заклікаюць царкву «паспрыяць веры, адзін раз перададзенай сьвятым» (Юд. 1:3).

І ўсё ж гэтыя сымбалі толькі агульна кранаюць тэму дзеі Хрыста, а таму не тлумачаць усёй паўнаты Дабравесьця. Сапраўднае падзяленьне ў бачнай царкве адбылося ў часы Рэфармацыі. І дзея Хрыста сталася ў тым ключавым пытаньнем. Дакладней, спрэчка вакол вучэньня аб апраўданьні толькі вераю апынулася ў цэнтры палемікі, якая й распаліла Рэфармацыю. Па гэтым пытаньні царква падзялілася на пратэстанцкі і рыма-каталіцкі лягеры. Пратэстантызм сьцьвярджае вучэньне аб апраўданьні толькі верай *(sola fide)*, а рыма-каталіцызм, у адпаведнасьці з пастановамі Трыдэнцкага сабору, яго адмаўляе, аддаючы перавагу погляду на апраўданьне як на вынік спалучэньня веры і дзеяў. Рэфармацыя таксама выявіла розьніцу ў іншым пытаньні, а менавіта ў разуменьні дасканаласьці і выключнасьці началеньня Ісуса Хрыста над Сваёй царквой і, зрэшты, над усім стварэньнем.

Усяленскія сымбалі веры раньняй царквы і ключавыя аспэкты вучэньня Рэфармацыі, узятыя поруч, акрэсьліваюць прынцыпы абвяшчэньня Эвангельля, вернага вучэньню Бібліі. Сымбалі і разнастайныя вызнаньні і катэхізісы Рэфармацыі даюць годнае падсумаваньне палажэньняў веры, а таксама нясуць яснасьць у пытаньні веры і Дабравесьця.

«Слова стала целам: пастанова аб хрысталёгіі служэньня *Ligonier*» мае намерам прапанаваць царкве сёньняшняга пакаленьня (а з Божага дабраславеньня — і наступнага) кароткую вытрымку датычна асобы і дзеі Хрыста, якая апіраецца на багацьце спадчыны ўсяленскіх сымбаляў і багаслоўя Рэфармацыі. Магчыма, гэтая пастанова і дваццаць шэсьць артыкулаў сьцьверджаньняў і абвяржэньняў, дададзеныя да яе, змогуць паслужыць каталізатарам далейшага абмеркаваньня і разважаньня аб гэтых прынцыповых прадметах хрысталёгіі. Можа стацца, што сама гэтая пастанова

дакажа нават сваю карыснасьць царкве, бо ўсё было зробленае для зручнасьці сумеснага прамаўленьня пастановы ў супольнасьці. Мы жадаем, каб кожны, хто пачуе гэтую пастанову, даведаўся, што «Ісус Хрыстос — Госпад!».

Пастанова

Пастанова складаецца з шасьці сэгмэнтаў альбо разьдзелаў. Першы зь іх служыць прадмовай і мае два ключавыя словы: *спавядаем* і *цешымся*. Бог адкрывае сябе і Сваю волю на старонках Сьвятога Пісаньня. Але ўсё ж існуюць «утоеныя рэчы», веданьне якіх належыць Яму аднаму (Др. Зак. 29:29). Мы мусім заўсёды ўсьведамляць нашую абмежаванасьць у справе багаслоўя. Акурат таму мы пачынаем са спавяданьня *таямніцы* і *цуду* Эвангельля. Першасным фокусам гэтае пастановы ёсьць уцелаўленьне, якое мы ёміста вызначаем у словах: *«...Божага ўцелаўленьня».* Асоба Хрыста непасрэдна прыводзіць нас да дзейнасьці Хрыста, і таму мы супольна цешымся Ягонай збаўчай дзеяй.

Другі сэгмэнт акцэнтуе ўвагу на сапраўднасьці боскасьці Хрыста, бачачы Яго нароўні зь іншымі асобамі Трыадзінага Бога. Гэты разьдзел завяршаецца пераказам фармулёўкі з Халкідонскага вызначэньня. З моманту ўцелаўленьня Хрыстос мае і заўсёды будзе мець дзьве прыроды ў адной асобе.

Тлумачэньне ўцелаўленьня прыведзенае ў трэцім сэгмэнце, дзе падкрэсьліваецца сапраўднасьць чалавечай прыроды Хрыста. Ён нарадзіўся. Ён — Эмануэль, што азначае «з намі Бог» (Мц. 1:23). Тут таксама мы вызнаём Ягоную сьмерць, пахаваньне, уваскрасеньне, узьнясеньне і другое прышэсьце. Усё гэта ёсьць гістарычнымі фактамі ўцелаўленьня.

Багаслоўскія факты ўцелаўленьня даюцца ў чацьвёртым разьдзеле, які базуецца на ўяўленьнях з часоў Рэфармацыі. Дзеля нас Ісус быў дасканала паслухмяны. Ён *выканаў патрабаваньні закона* (дзейснае паслушэн-

ства) і аплаціў цану ягонага парушэньня (цярплівае паслушэнства). Ён быў беспахібным Ягняткам, які зьдзейсьніў замяшчальнае адкупленьне дзеля нас. Ён вырашыў найцяжэйшую праблему, што паўстае перад кожным чалавекам, — сьвяты гнеў Божы. Гэты сэгмэнт завяршаецца абвяшчэньнем вучэньня аб залічваньні. Нашыя грахі былі залічаныя Хрысту, а Ягоная праведнасьць залічылася нам. Таму мы маем мір з Богам, да таго ж выключна праз тое, што ўчыніў дзеля нас Хрыстос. Мы апранутыя ў адзеньне Ягонай праведнасьці.

Трохбаковае служэньне (лат. *munus triplex*) Хрыста зьяўляецца зручнай багаслоўскай канцэпцыяй, якая коратка паведамляе аб дзеі Хрыста. Тры служэньні — прарочае, сьвятарскае і царскае — былі паасобнымі пасрэдніцкімі ролямі паміж людзьмі і Богам у Старым Запавеце. Ісус спалучае ўсе тры разам у Ягонай адзінай асобе і дасканала выконвае кожнае зь іх. Тут мы разважаем ня толькі аб пасрэдніцкай дзеі Хрыста на крыжы ў мінулым, але й таксама аб Ягоным цяперашнім служэньні ў якасьці хадайніка за нас, што знаходзіцца праваруч Айца.

Заключны сэгмэнт сьцьвярджае ўнікальнае, сьціслае вызнаньне: *Ісус Хрыстос — Госпад!* Кожнае сапраўднае багаслоўе вядзе да хвалы і пакланеньня. Адпаведна, пастанова завяршаецца ключавым дзеясловам *славім*. У пакланеньні Хрысту цяпер мы рыхтуемся да нашага занятку ў вечнасьці.

### Дваццаць шэсьць артыкулаў сьцьверджаньняў і абвяржэньняў

Выразы пастановы — гэта ўводзіны ў вывучэньне хрысталёгіі, што запрашаюць да дасьледаваньня багацьця біблейскага вучэньня аб асобе і дзеі Хрыста. Але каб ісьці далей, былі дададзеныя дваццаць шэсьць артыкулаў сьцьверджаньняў і адмаўленьняў з доказамі зь Сьвятога Пісаньня для кожнага зь іх. Для кожнага артыкула выпісаны цалкам адзін галоўны тэкст зь Бібліі поруч зь іншымі дапаможнымі тэкстамі, што даюцца

ў спасылках. Артыкулы маюць выключнае значэньне, бо яны дэмаркуюць межы біблейскага вучэньня аб асобе і дзеі Хрыста.

Артыкул 1 служыць у якасьці прадмовы, у якой сцьвярджаецца аб уцелаўленьні. Артыкул 2 дэкляруе боскасьць Хрыста, у той час як у артыкулах 3–5 выкладзены біблейскі погляд на дзьве прыроды адзінай асобы Хрыста. Артыкулы 6–9 раскрываюць сапраўднасьць чалавечай прыроды Хрыста. У артыкулах 10–26 увага пераносіцца з асобы Хрыста на Ягоную дзею. Яны пачынаюцца са сьцьверджаньня вучэньня аб збаўленьні і сканчваюцца замалёўкай трохбаковага служэньня Хрыста.

Прыведзеныя абвяржэньні таксама маюць выключную важнасьць. Адмаўленьне нейкага перакананьня ўяўляецца досыць непапулярнай рэччу ў наш час цярпімасьці. Але ж прыведзеныя артыкулы сьцьверджаньняў і абвяржэньняў ня ёсьць выразам якойсьці ганарлівай пыхі. Наадварот, яны прапанаваныя з надзеяй на тое, што пры іх дапамозе царква застанецца ў бясьпечных межах біблейскага вучэньня. У 2 Ян. 1:9 гаворыцца, што «кожны, хто пераступае вучэньне Хрыстовае і не жыве ў ім, ня мае Бога». Гэты выраз адносіцца да адыходу ад біблейскага вучэньня аб Хрысьце альбо да выхаду хрысталягічных уяўленьняў па-за рамкі Божага адкрыцьця ў Ягоным слове. Паколькі дваццаць шэсьць артыкулаў ахопліваюць розныя радкі пастановы, то яны таксама могуць паглыбіць разуменьне біблейскага вучэньня аб Хрысьце.

Хтосьці справядліва можа спытацца, ці сапраўды гэтая новая пастанова зьяўляецца неабходнай. І гэта добрае пытаньне. На тое мы прапануем тры прычыны ў абгрунтаваньне пастановы. Мы верым, што яна паслужыць на карысьць сёньняшнім царкоўным пакаленьню і навуцы за кошт ейнай скіраванасьці на выклікі мінуўшчыны і сучаснасьці. Мы ўпэўненыя, што для тых, хто служыць справе дабравесьця, пастанова стане добрым сродкам распазнаньня вартасьці іншых

супрацоўнікаў на Божай ніве. Нарэшце, мы прадчуваем надыход неўзабаве трывожных часоў для царквы, а таму мы спадзяёмся, што гэтая пастанова будзе нагадваць нам усю сутнасьць Эвангельля — ягоную прыгажосьць, неабходнасьць і неадкладнасьць. Разгледзім кожную з прычынаў падрабязьней.

### Для пакланеньня і навучаньня

Служэньне *Ligonier* сьціпла прапануе гэтую пастанову царкве. Ад раньняга веку хрысьціяне выкарыстоўвалі сымбалі веры ў царкоўнай літургіі. Ёсьць спадзяваньне, што гэтая пастанова зможа паслужыць той самай мэце. Сымбалі могуць быць карыснымі сродкамі дасьледаваньня неабсяжных абшараў біблейскага вучэньня. Таксама маем спадзеў, што пастанова і дваццаць шэсьць артыкулаў могуць быць скарыстаныя ў царкве як спадарожнік у далейшым дасьледаваньні Бібліі і развагаў над ёю. Вучэньне аб асобе і дзеі Хрыста — найважнейшае для ідэнтычнасьці і здароўя царквы. Кожнае пакаленьне мае патрэбу вывучаць і нанова сьцьвярджаць артадаксальнае разуменьне асобы і дзеі Хрыста. Мы верым, што пастанова здолее ў гэтым дапамагчы.

### Для еднасьці вакол Эвангельля

Па ўсім сьвеце ўзьнікае багата пазаканфесійных цэркваў, арганізацыяў і рухаў, шмат зь якіх служаць распаўсюду Дабравесьця. Прытым часам даволі цяжка адрозьніць, у якім разе маюць атрымацца здаровыя супраца і паяднаньне. Імаверна, што гэтая пастанова зможа паслужыць вызначэньню годных на тое братоў і сёстраў, а таксама ўмацуе руплівасьць у справе Эвангельля.

### Для такіх часоў, як сёньня

Ва ўнівэрсытэцкім горадзе Оксфард стаіць помнік Пакутнікаў, які ўвекавечвае памяць пра ахвяры мноства рэфарматараў царквы ў Брытаніі, сярод якіх Томас

Кранмэр, Нікалас Рыдлі, Х’ю Латымэр. Аб іх гаворыцца, што яны аддалі свае целы на спаленьне, каб засьведчыць сьвятыя праўды, якія яны сьцьвярджалі і ад якіх не адступаліся насуперак памылкам рымскай царквы, і што ім быў у радасьць дар ня толькі верыць у Хрыста, але зьнесьці пакуту дзеля Яго.

Усе яны верылі, сьцьвярджалі і трымаліся сьвятых праўдаў Эвангельля Ісуса Хрыста. У сьведчаньні гэтых праўдаў яны абвяшчалі, абаранялі і нават цярпелі за іх. Цягам стагодзьдзяў шмат хто далучыўся да гэтых рэфарматараў. Многа цэркваў у сучасным заходнім грамадзтве цешыцца свабодай веравызнаньня. Але пытаньне ў тым, як доўга гэта мае цягнуцца. Вельмі верагодна, што цяперашняе і наступныя пакаленьні будуць пакліканыя цярпець за веру ў Хрыста. Таму досыць нямудра быць на тое непадрыхтаваным.

Сапраўды, ісьціны датычна асобы і дзеі Хрыста — гэта годныя аб’екты, каб у іх верыць, іх сьцьвярджаць і трымацца, а таксама прыняць пакуту за іх. Бо жыцьцё — у Хрысьце.

Быў адзін момант у зямным жыцьці Хрыста, калі ці ня ўся грамада людзей пакінула Яго. Побач зь Ім засталіся адно Ягоныя вучні. Тады Ён спытаўся ў іх, ці ня маюць яны намеру таксама сысьці. Але Пётар ад імя астатніх адказаў: «Госпадзе, да каго нам ісьці? Ты маеш словы вечнага жыцьця, і мы паверылі і спазналі, што Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога» (Ян. 6:68–69). Пазьней адзін з дванаццаці меў пэўныя сумневы, бо Ісус быў укрыжаваны і пахаваны. Было шмат сьведкаў Ягонага ўваскрасеньня, але ж Фама сумняваўся. І тады Ісус сам аб’явіўся Фаме, і той дакрануўся да Ягоных ранаў, якія Ён панёс за нашыя грахі. Тады Фама вызнаў: «Госпадзе мой і Божа мой!» (Ян. 20:28).

Гэтак верым і мы. Гэтае ж вызнаём і мы.